**24.** Прачытайце ўважліва народныя выразы:

*1. Слова – серабро, ма..чанне – золата.*

*2. Яму раніцаю росна, у по..дзень млосна, а ўвечары камары кусаюць.*

*3. Рана ..станеш – многа зробіш.*

У якім прыкладзе на месцы пропуску трэба напісаць літару ***ў***?

**А)** ва ўсіх выразах. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** у 1. **Г)** у 2. **Д)** у 3.

---

**25.** Падлічыце колькасць слоў у скорагаворцы, якія пачынаюцца з [***ч***].

*Чатыры чорныя карчы чарнелі чорнымі чубамі.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 4. **Г)** 5. **Д)** 6.

---

**26.** Прачытайце ўважліва вершаваныя радкі:

*Здароў, марозны, звонкі вечар!*
*Здароў, скрыпучы, мяккі снег!...*

Хто з мастакоў слова з’яўляецца аўтарам дадзеных радкоў?

**А)** Максім Танк. **Б)** Анатоль Грачанікаў. **В)** Максім Багдановіч.
**Г)** Пятрусь Броўка. **Д)** Якуб Колас.

---

**27.** Дадзены сказ:

***Дрыготка** шапоча на асіне лістота.*

Якім членам сказа з’яўляецца выдзеленае слова?

**А)** дзейнікам. **Б)** выказнікам. **В)** дапаўненнем.
**Г)** азначэннем. **Д)** акалічнасцю.

---

**28.** Выберыце з прапанаваных назоўнікі, якія маюць форму толькі множнага ліку.

*1) шахматы; 2) дровы; 3) бочкі; 4) кругі.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** няма патрэбных назоўнікаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**29.** Якое слова прапушчана ў народным выслоўі?

*Узяўся за гуж – не кажы, што … .*

**А)** не паснедаў. **Б)** не выспаўся. **В)** не дуж.
**Г)** заблудзіўся. **Д)** не навучыўся.

---

**30.** Даследчык старажытных рукапісаў называецца … .

**А)** палеограф. **Б)** археолаг. **В)** геолаг. **Г)** архівіст. **Д)** філолаг.

---

КОНКУРС

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб’яднанне «Беларуская асацыяцыя «Конкурс»
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/

Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 16. Тыраж 19500 экз. Мінск. 2024 г.

# Гульня-конкурс па беларускай мове і літаратуры «БУСЛІК-2024»

*Чацвер, 22 лютага 2024 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–2 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 5-6 класаў

**1.** Рамонкі, фіялкі, званочкі, пралескі – гэта … .

**А)** дрэвы. **Б)** кветкі. **В)** кусты. **Г)** птушкі. **Д)** насякомыя.

---

**2.** Колькі слоў, якія маюць два склады ў прыказцы?

*Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднай крыніцы.*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**3.** Прачытайце ўважліва сказ:

*Над ракой, над лугам і лесам зазіхацела пасля дажджу **вясёлка**.*

Якой часцінай мовы з’яўляецца выдзеленае слова?

**А)** назоўнікам. **Б)** дзейнікам. **В)** прыметнікам.
**Г)** выказнікам. **Д)** дзеясловам.

---

**4.** Музыкант, які іграе на баяне, называецца … .

**А)** гітарыст. **Б)** піяніст. **В)** баяніст. **Г)** саксафаніст. **Д)** скрыпач.

---

**5.** Закончыце народны выраз: *Парожняя бочка моцна … .*

**А)** гайдаецца. **Б)** грыміць. **В)** б’ецца. **Г)** свішча. **Д)** штурхаецца.

**6.** Дадзены словы на беларускай мове:

*1) адліга; 2) вясёлка; 3) спёка; 4) завіруха.*

Падбярыце адпаведнікі ў рускай мове:

*а) зной; б) радуга; в) вьюга; г) оттепель.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-а, 2-б, 3-г, 4-в. **В)** 1-б, 2-а, 3-г, 4-в.
**Г)** 1-в, 2-г, 3-а, 4-б. **Д)** 1-г, 2-б, 3-а, 4-в.

---

**7.** Выберыце правільна напісаныя словы.

*1) спектакаль; 2) тэатар; 3) нацюрморт; 4) метал.*

**А)** усе словы. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**8.** Дадзены словазлучэнні:

*1) **гуляць** па парку; 2) чытаць **выразна**; 3) цікавая **кніга**.*

У якіх словазлучэннях правільна выдзелена галоўнае слова?

**А)** ва ўсіх. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 1, 3. **Д)** у 2, 3.

---

**9.** Якое дрэва, каб магло размаўляць, сказала б пра сябе: “Я засцілаю дол іглідай, спрадвеку слаўлюся жывіцай”?

**А)** дуб. **Б)** сасна. **В)** бяроза. **Г)** таполя. **Д)** клён.

---

**10.** Суаднясіце часткі народных выразаў.

*1) сказанага слова …; 2) якая справа …; 3) якія самі … .*

*а) такая і слава; б) такія і сані; в) да губы не вернеш.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-а, 2-в, 3-б. **В)** 1-б, 2-а, 3-в. **Г)** 1-в, 2-а, 3-б. **Д)** 1-в, 2-б, 3-а.

---

**11.** У народзе гавораць: *“Лепш сініца ў руцэ, чым … у небе”*.

Якое слова прапушчана?

**А)** жаваранак. **Б)** ястраб. **В)** каршун. **Г)** журавель. **Д)** сокал.

---

**12.** У якіх лічэбніках на месцы пропуску напішаце мяккі знак?

*1) сем..; 2) восем..; 3) шэсц..; 4) пяц.. .*

**А)** ва ўсіх дадзеных лічэбніках. **Б)** у 1, 2. **В)** у 2, 3. **Г)** у 2, 4. **Д)** у 3, 4.

---

**13.** Вызначце пабуджальны(-ыя) сказ(-ы).

*1. Сябар заўсёды прыйдзе на дапамогу.*

*2. Дапамажы, калі ласка, занесці кнігі ў бібліятэку.*

*3. Ці зможаш ты дапамагчы рашыць задачу па матэматыцы?*

**А)** усе сказы. **Б)** няма патрэбнага сказа. **В)** 1. **Г)** 2, 3. **Д)** 3.

---

**14.** Дадзены ўстойлівыя спалучэнні:

*1) абяцаць залатыя горы; 2) гара з плячэй звалілася;*

*3) гарою стаяць; 4) горы варочаць; 5) не за гарамі.*

Якому спалучэнню адпавядае лексічнае значэнне *‘вельмі многа рабіць’*?

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**15.** Выберыце словы, у якіх на месцы пропуску напішаце літару **ы**.

*1) ст..лаж; 2) ч..гун; 3) ч..мадан; 4) ст..ліст.*

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

---

**16.** Пра што-небудзь малое, мізэрнае ў народзе гавораць: *“З камарыную **дзюбу**.”* Вызначце склон выдзеленага назоўніка.

**А)** назоўны склон. **Б)** родны склон. **В)** давальны склон.
**Г)** вінавальны склон. **Д)** месны склон.

---

**17.** Колькі дзеясловаў ужыта ў вершаваных радках Дануты Бічэль?

*Палюбіў каток каморку.*
*Там смятанка і зацішак.*
*Зранку і да падвячорку*
*Спіць і ў сне ён бачыць мышак.*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**18.** Выберыце з прапанаваных прыкладаў устойлівыя спалучэнні.

*1) гнуць на адзін капыл; 2) сем пятніц на тыдні; 3) дваццаць пяць рублёў.*

**А)** усе спалучэнні. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**19.** *У адной мінуце … секунд*.

**А)** шэсцьдзесят. **Б)** шэсцьдзясят. **В)** шэсцьдзісят.
**Г)** шесцьдзясят. **Д)** шэстьдзясят.

---

**20.** Чым з’яўляюцца паміж сабой устойлівыя спалучэнні х*оць касой касі – як кот наплакаў*?

**А)** сінонімамі. **Б)** амонімамі. **В)** антонімамі. **Г)** паронімамі. **Д)** амографамі.

---

**21.** Прачытайце ўважліва народнае выслоўе:

*І шыла, і мыла, і прала, і ткала – і ўсё языком.*

Які дзеяслоў можа ўжывацца і як назоўнік з лексічным значэннем *‘інструмент для пракалвання адтулін у выглядзе завостранага стрыжня з дзяржальнам’*?

**А)** няма такога дзеяслова. **Б)** шыла. **В)** мыла. **Г)** прала. **Д)** ткала.

---

**22.** Дадзены назвы гарадоў:

*1) Скідзель; 2) Ліда; 3) Смаргонь; 4) Пінск; 5) Паставы.*

Як правільна запісаць назвы ў алфавітным парадку?

**А)** 1, 2, 3, 4, 5. **Б)** 1, 3, 5, 4, 2. **В)** 1, 3, 2, 4, 5. **Г)** 2, 1, 3, 4, 5. **Д)** 2, 5, 4, 1, 3.

---

**23.** Якія словы з прапанаваных напісаны па-беларуску няправільна?

*1) стэпь; 2) жолудь; 3) ночь.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.